# ДЛЯ СТУДЭНТАЎ

Сімвалічны тыдзень ведаў, які будзе доўжыцца на працягу верасня, традыцыйна яднае студэнтаў Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта на пачатку новага навучальнага года.

Навучэнцы і выкладчыкі прынялі ўдзел ва ўрачыстай цырымоніі прысвячэння ў студэнты, запамінальна прайшла і святочная танцавальна-забаўляльная праграма для першакурснікаў «Будзь разам з намі!». Значнай падзеяй стала адкрыццё фотавыставы «Сфатаграфуйся са Скарынам», прымеркаваная да 500-годдзя беларускага кнігадрукавання.